УДК 811.161.3

Радзькова Т. С., Савіцкая І. У.

# ВЫКАРЫСТАННЕ СКАРАЧЭННЯЎ У НАВУКОВЫХ ТЭКСТАХ

*Навуковы кіраўнік: Савіцкая І.У., канд. філал. навук, дацэнт*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**

У артыкуле прыводзяцца прыклады розных відаў скарачэнняў, якія ўжываюцца ў навуковых тэкстах, а таксама правілы скарачэння слоў і словазлучэнняў у беларускай мове.

**Ключавыя словы:** абрэвіятура, скарачэнне, графічнае скарачэнне, складанаскарочанае слова

Radkova T. S., Savitskaya I. V.

# USE OF ABBREVIATIONS IN SCIENTIFIC TEXTS

*Scientific Supervisor: Savitskaya I. V., Associate Professor, Candidate of Sciences in Philology*
*Belarusian National Technical University*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**

The article provides examples of various types of abbreviations used in scientific texts, as well as rules for abbreviating words and phrases in the Belarusian language.

**Keywords:** abbreviation, graphic abbreviation, compound word

У навуковай літаратуры шырока прымяняюцца розныя віды скарачэнняў: літарныя абрэвіятуры (*ГДТ – гідрадынамічны трансфарматар, ПВТ – парк высокіх тэхналогій*), гукавыя абрэвіятуры (*МАЗ – Мінскі аўтамабільны завод, РУЗ – рухавік унутранага згарання*), складанаскарочаныя словы (*генплан –*

*генеральны план, лінкар – лінейны карабель*), графічныя скарачэнні (*в-аў – востраў, вобл. – вобласць, воз. – возера*), скарачэнні без галосных (*млн, млрд*), скарачэнні змешанага тыпу (*БелАЗ – Беларускі аўтамабільны завод, БелНДВІ – Беларускі навукова-даследчы ветэрынарны інстытут*).

Пры выкарыстанні скарачэнняў, прынятых у той ці іншай галіне навуковых ведаў, а таксама пры ўтварэнні ўласных скарачэнняў варта кіравацца шэрагам правілаў [1, с. 100–101]:

1. Скарачэнні павінны быць зразумелыя чытачу.
2. Скарачэнні павінны быць дарэчныя ў дадзеным тэксце.
3. Неабходна ва ўсім тэксце ад пачатку да канца вытрымліваць адзіны падыход да скарачэння адных і тых жа слоў. Напрыклад, калі скарачаюцца словы *год, гады* да *г., гг.,* то аналагічна трэба рабіць і ў адносінах да слоў *стагоддзе, стагоддзі – ст., стст.*
4. Форма скарачэння слова ці словазлучэння павінна быць аднолькавай на працягу ўсяго тэксту.
5. Скарачэнні не павінны сваёй формай нагадваць немілагучныя выразы ці паняцці, якія ўжо існуюць.

Графічныя скарачэнні бываюць агульнапрынятыя (іх ведаюць усе носьбіты мовы, бо яны не патрабуюць спецыяльнага тлумачэння) і ўмоўныя (яны становяцца зразумелымі пры наяўнасці спісу скарочаных напісанняў) [3, с. 170]. У Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі [2, с. 27–28] прыводзяцца наступныя агульнапрынятыя скарачэнні:

*акад. – акадэмік*
*в. – вёска;*
*в-аў – востраў*
*вобл. – вобласць*
*воз. – возера*
*г. – год*
*г. – горад*
*гг. – гады*
*г.зн. – гэта значыць*
*гл. – глядзі*
*гр. – грамадзянін*
*дац. – дацэнт*
*заг. – загадчык*

*зб. – зборнік*
*і г.д. – і гэтак далей*
*і да т.п. – і да таго падобнае*
*і інш. – і іншае*
*і пад. – і падобнае*
*нам. – намеснік*
*напр. – напрыклад*
*н.э. – наша эра*
*параўн. – параўнай*
*п-аў – паўвостраў*
*праф. – прафесар*
*р. – рака*
*руб. – рубель*
*с. – старонка*
*ст. – стагоддзе*
*стст. – стагоддзі*
*тав. – таварыш*
*т-ва – таварыства*
*т.зв.– так зван*

Пры выкарыстанні як агульнапрынятых, так і ўласных скарачэнняў неабходна ведаць патрабаванні да іх утварэння і напісання. Да ліку такіх патрабаванняў можна аднесці наступныя:

1. Калі ўсякаецца канчатковая частка слова, то астатняя пасля скарачэння частка павінна:

– дазваляць лёгка і беспамылкова аднаўляць поўнае слова: *філас. – філасофія, філасофскі; філал. – філалогія, філалагічны* (скарачэнне не павінна быць у форме *філ.*);

– заканчвацца на зычны: *архіт. – архітэтура, архітэктурны; буд. – будаўніцтва, будаўнічы.*

Калі пры скарачэнні слова ў канцы аказваюцца падвоеныя зычныя, другая літара павінна адсякацца: *камен. – каменны, ваен. – ваенны* (а не *каменн., ваенн.*). Калі ж у канцы аказалася некалькі розных зычных, скарачэнне павінна заканчвацца на апошняй з іх: *лінгв. – лінгвістыка, геагр. – геаграфія* (а не *лін., геаг.*).

2. Кропка пры скарачэнні ставіцца ў тым выпадку, калі слова з адсечанай канчатковай часткай пры чытанні ўслых вымаўляецца ў

поўнай, а не скарочанай форме. Напрыклад, *г.* пры чытанні вымаўляецца *год*, а не *гэ*; *воз.* – адпаведна *возера*, а не *воз* і інш.

3. Кропка не ставіцца:

– у канцы скарачэння ў тым выпадку, калі скарочанае словазлучэнне пры чытанні ўголас вымаўляецца ў скарочанай форме: *ГДП (гідрадынамічная перадача)*, а не *ГДП., Г.Д.П.*;

– у канцы скарачэння, калі выключана сярэдняя частка слова, замененая злучком, і скарачэнне заканчваецца на апошняй літары поўнага словы: *г-н, выд-ва, з-д* (*грамадзянін, выдавецтва, завод*);

– пры графічным абазначэнні скарачэння касой рысай: *п/п* (*па парадку*);

– у сярэдзіне падвоенага адналітарнага графічнага скарачэння: *стст., гг.*;

– у канцы скарачэнняў, утвораных шляхам выдалення галосных: *млн, млрд*;

– пасля скарочаных абазначэнняў стандартных метрычных адзінак: *кг – кілаграм, мм – міліметр, см – сантыметр, га – гектар, м – метр, л – літр, т – тона, ц – цэнтнер* і інш.

4. У множным ліку змяняюць форму некаторыя графічныя скарачэнні слоў: яны падвойваюцца, дзякуючы чаму чытач не адчувае цяжкасцяў пры чытанні: *у 2014–2015 гг.* Змяняецца ў множным ліку і форма графічных скарачэнняў са злучком, які замяняе сярэднюю частку слова: *з-д – з-ды, м-ва – м-вы, р-н – р-ны.*

Не змяняюць форму ў множным ліку графічныя скарачэнні слоў тыпу *тамы, лісты, старонкі, слупкі* (*с. 54–55, арт. 2–5, т. 1–10*), а таксама ўсе неадналітарныя скарачэнні з кропкай на канцы, напрыклад: *у табл.7 і 8, арт. 10 і 11 УК Рэспублікі Беларусь.*

5. Нарошчванне склонавых канчаткаў у парадкавых лічэбніках, пазначаных арабскімі лічбамі, па замацаванай традыцыі выконваецца наступным чынам:

– да лічэбніка дадаецца адна літара, калі перад апошняй літарай слова ідзе галосны гук, напрыклад: 6-*я (шостая, шостыя), у* 6-*м (у шостым)* (няправільна скарачаць 6-*ая,* 6-*ыя, у* 6-*ым*);

– да лічэбніка можа дадавацца двухлітарные нарошчванне, калі перад апошняй літарай ідзе зычны гук, напрыклад: 6-*га,* 6-*му,* 6-*мі* (няправільна 6-*ага,* 6-*аму,* 6-*ымі*).

Склонавыя канчаткі пры некалькіх парадкавых лічэбніках залежаць ад колькасці слоў і формы падзелу:

– калі адзін за адным ідуць два парадкавыя лічэбнікі, аддзеленыя коскай або злучальным злучнікам, то склонавы канчатак нарошчваюць у кожнага з іх, напрыклад: *10-я, 12-я старонкі; 9-ы і 10-ы малюнкі, 5-я і 7-я табліцы;*

– калі ж адзін за адным ідуць больш за два парадкавыя лічэбнікі, аддзеленыя коскай або злучальным злучнікам, то склонавы канчатак нарошчваюць толькі ў апошняга лічэбніка, напрыклад: *студэнты 2, 3, 4-х курсаў; 70, 80, 90-я гады.*

Склонавыя канчаткі не ставяцца ў парадкавых лічэбніках, калі яны стаяць пасля назоўнікаў (*у раздзеле 6, на малюнку 2, у п. 3*), пасля рымскіх лічбаў (*III квадрант, II сегмент*), а таксама ў датах (*10 студзеня, у 2023 г.*).

6. Складаныя прыметнікі, першай часткай якіх з'яўляецца лічэбнік, пазначаны лічбай, трэба пісаць праз злучок: *9-павярховы, 5-працэнтны, 20-градусны, 50-гадовы*.

Пры ўказанні межаў паміж велічынямі ставіцца працяжнік *(20–25%)*. Для ўказання межаў паміж адмоўнымі велічынямі або паміж адмоўнай і станоўчай велічынямі ўжываюцца прыназоўнікі «ад» і «да» (*ад –2 да +3*).

7. Дробавыя лікі, як правіла, запісваюцца дзесятковым дробам (*10,3; 2,1)*. Для абазначэння простага дробу ўжываецца касая рыса (1/2, 3/5, а/б). Дробы ў тэксце трэба пісаць толькі лічбамі.

Калі пры скарачэнні ўзнікае неабходнасць у пераносе, то варта кіравацца наступнымі правіламі:

– пры пераносах не аддзяляюцца ініцыялы ад прозвішчаў (*С.П. Сакалоў*);

– на аддзяляюцца пры пераносе скарачэнні *і г.д., г.зн., і інш.;*

– не пераносіцца на наступны радок працяжнік (*20–22 %*);

– не аддзяляюцца скарочаныя назвы ад тых лічбаў, да якіх яны адносяцца (*XXI ст., у 2022 г., 12 см, 5 кг, 235 с.*);

– не дапускаецца аддзяленне пры пераносе парадкавых лічэбнікаў са склонавымі канчаткамі (*7-я, 10-я*);

– не аддзяляюцца лічбы і літары з дужкай або кропкай ад наступнага слова ці тэксту, напрыклад: *1. Дыферэнцыяльныя ўраўненні; 1) дыферэнцыяльныя ўраўненні; а) дыферэнцыяльныя ўраўненні;*

– не дапускаюцца пераносы, якія могуць выклікаць скажэнне сэнсу або немілагучнасць.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Евтюгина, А. А. Стилистика научной речи: учебное пособие для студентов гуманитарных специальностей / А. А. Евтюгина [и др.]; под ред. А. А. Евтюгиной. – Екатеринбург: РГППУ, 2013. – 479 с.

2. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. – 144 с.

3. Сямешка, Л. І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба, З. І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.